# *§ 63–0. Саюзная дзяржава Беларусі і Расіі

**ПАЛІТЫЧНАЯ ІНТЭГРАЦЫЯ**
**ЭКАНАМІЧНАЯ ІНТЭГРАЦЫЯ**
**СУПОЛЬНАСЦЬ БЕЛАРУСІ І РАСІІ**
**САЮЗ БЕЛАРУСІ І РАСІІ**
**САЮЗНАЯ ДЗЯРЖАВА**
**ДЗЕНЬ ЯДНАННЯ НАРОДАЎ БЕЛАРУСІ І РАСІІ**

Працэс стварэння Саюзнай дзяржавы

**1. Асноўныя этапы станаўлення міждзяржаўных адносін Беларусі і Расіі пасля распаду СССР.** Рэспубліка Беларусь і Расійская Федэрацыя пасля распаду Савецкага Саюза дэманструюць унікальны прыклад інтэграцыі дзвюх незалежных дзяржаў. Шчыльныя саюзныя адносіны паміж Беларуссю і Расіяй абумоўленыя геаграфічнай і культурна-гістарычнай блізкасцю дзвюх краін і народаў, узаемадапаўняльнасцю эканомік, шчыльнымі кааперацыйнымі сувязямі беларускіх і расійскіх кампаній.




*Мурал «Масква–Мінск». Мастак А. Кашак. Г. Мінск. 2016 г.*

Да стварэння Саюзнай дзяржавы Беларусь і Расія рухаліся паэтапна. Важным этапам саюзнай інтэграцыі была ініцыятыва Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкі аб эканамічнай інтэграцыі з Расійскай Федэрацыяй, падтрыманая беларускім народам на рэспубліканскім рэферэндуме 1995 г.

Дамова аб стварэнні Саюзнай дзяржавы вызначыла раней не бачанае ў сусветнай практыцы шчыльнае збліжэнне дзвюх дзяржаў ва ўмовах, калі Беларусь і Расія заставаліся самастойнымі ўдзельнікамі міжнароднай супольнасці.

| | |
|---|---|
| 25 чэрвеня 1992 г. | Усталяванне дыпламатычных адносін суверэнных дзяржаў Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі |
| 21 лютага 1995 г. | Падпісанне Дамовы аб дружбе, добрасуседстве і супрацоўніцтве паміж Рэспублікай Беларусь і Расійскай Федэрацыяй |
| 2 красавіка 1996 г. | Дамова аб стварэнні Супольнасці Беларусі і Расіі |
| 2 красавіка 1997 г. | Дамова аб стварэнні Саюза Беларусі і Расіі |
| 8 снежня 1999 г. | Дамова аб стварэнні Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі |

Якое свята адзначаецца народамі Беларусі і Расіі 2 красавіка?

**Органы, якія рэгулююць дзейнасць Саюзнай дзяржавы**

Дамова аб стварэнні Саюзнай дзяржавы мае на ўвазе не зліццё дзвюх дзяржаў або паглынанне адной дзяржавай іншай, а іх аб'яднанне для рэалізацыі ўзаемавыгадных для абодвух бакоў задач. Дамова прадугледжвае стварэнне:

- органаў, якія рэгулююць дзейнасць Саюзнай дзяржавы (Вышэйшы Дзяржаўны Савет, Парламенцкі Сход Саюза Беларусі і Расіі, Савет Міністраў Саюзнай дзяржавы, Пастаянны Камітэт Саюзнай дзяржавы);
- бюджэту, які фарміруецца штогод адлічэннямі з бюджэтаў краін-удзельніц і выдаткоўваецца на рэалізацыю супольных праграм і праектаў Саюзнай дзяржавы.

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

Выкарыстоўваючы інфармацыю інфармацыйна-аналітычнага партала Саюзнай дзяржавы:

- *вызначце склад Вышэйшага Дзяржаўнага Савета, Парламенцкага Сходу, Савета Міністраў, Пастаяннага Камітэта і іх ролю ў рэалізацыі палажэнняў Дамовы аб стварэнні Саюзнай дзяржавы, распрацоўцы асноўных кірункаў агульнай палітыкі Саюзнай дзяржавы;*
- *складзіце схему, якая адлюстроўвае ўсе пералічаныя вышэй пытанні.*

**2. Фарміраванне адзінай эканамічнай, сацыяльнай і тэхналагічнай прасторы.** Дамова аб Саюзнай дзяржаве Беларусі і Расіі ў якасці адной з найважнейшых мэт новага інтэграцыйнага аб'яднання пазначыла павышэнне ўзроўню жыцця народаў, устойлівае сацыяльна-эканамічнае развіццё дзяржаў — удзельніц Саюза на аснове аб'яднання іх матэрыяльнага і інтэлектуальнага патэнцыялаў.

Значнасць эканамічнага партнёрства

Менавіта шчыльныя эканамічныя адносіны выступаюць падмуркам для беларуска-расійскай інтэграцыі ў межах Саюзнай дзяржавы. Расія трывала замацавала за сабой месца асноўнага знешнеэканамічнага партнёра Беларусі, найважнейшага спажыўца прадукцыі, якую вырабляюць беларускія прадпрыемствы. На Расію прыпадае больш за 50 % беларускага знешняга гандлю. Яна выступае практычна адзіным пастаўшчыком энергарэсурсаў на беларускі рынак. Для нашай краіны істотна, што ў рамках Саюзнай дзяржавы яна атрымлівае газ і нафту з Расіі па цэнах, блізкіх да ўнутрырасійскіх.

Супрацоўніцтва ў галіне энергетыкі

Сімвалам беларуска-расійскага супрацоўніцтва ў галіне энергетыкі зрабілася будаўніцтва беларускай атамнай электрастанцыі. На рэалізацыю гэтага праекта Расія дала Беларусі крэдыт у 10 млрд долараў.



*БелАЭС. Г. Астравец*

Для Расіі супрацоўніцтва з Беларуссю таксама мае істотнае эканамічнае значэнне. Праз нашу краіну праходзяць асноўныя транзітныя шляхі, якія звязваюць Расію з краінамі Цэнтральнай і Заходняй Еўропы.

Па беларускіх транспартных камунікацыях напрыканцы 2010-х гг. ажыццяўлялася да 70 % знешнегандлёвага абароту Расіі. Наша краіна забяспечвала транзіт прыблізна 50 % расійскай нафты і 30 % расійскага газу ў еўрапейскія краіны, прычым тарыфы на транзіт па тэрыторыі нашай краіны значна ніжэйшыя, чым у іншых дзяржавах.

Расія атрымлівае з Беларусі многія неабходныя ёй тавары, у прыватнасці грузавыя аўтамабілі, сельскагаспадарчыя машыны, халадзільнікі, мэблю, адзенне, абутак, прадукцыю харчовай прамысловасці. Асабліва значэнне для Беларусі мае тое, што на Расію прыпадае асноўная частка экспарту прадукцыі беларускага машынабудавання.

### Умацаванне эканамічнай інтэграцыі

Ва ўмовах заходніх санкцый Беларусь і Расія напачатку 2020-х гг. зрабілі захады, накіраваныя на далейшую інтэграцыю сваіх эканомік. У лістападзе 2021 г. прэзідэнты Беларусі і Расіі падпісалі пагадненне, якое зацвердзіла 28 інтэграцыйных праграм у рамках Саюзнай дзяржавы. Для Беларусі вельмі істотна, што гэтыя праграмы прадугледжваюць фарміраванне адзінага рынку газу, нафты, нафтапрадуктаў, электрычнай энергіі, развіццё атамнай энергетыкі. У 2022 г. Беларусь і Расія пачалі рэалізацыю супольных праектаў па вырабе імпартазамяшчальнай прадукцыі на базе найбуйнейшых беларускіх прамысловых прадпрыемстваў.

> «Гаворачы пра інтэграцыю, мы павінны дакладна разумець — усякая інтэграцыя магчымая, але без страты дзяржаўнасці і суверэнітэту».
>
> *А. Р. Лукашэнка*

### Супрацоўніцтва ў сферы асваення космасу

Сферай навукова-тэхнічнага супрацоўніцтва дзвюх дзяржаў з'яўляецца космас. Знакавым вынікам расійска-беларускага супрацоўніцтва ў рамках Саюзнай дзяржавы стаў палёт на Міжнародную касмічную станцыю першай касманаўткі Рэспублікі Беларусь,



*Першая беларуская жанчына-касманаўт, Герой Беларусі Марына Васілеўская і ўраджэнец Беларусі, Герой Расійскай Федэрацыі Алег Навіцкі перад стартам да Міжнароднай касмічнай станцыі 23 сакавіка 2024 г.*

Героя Беларусі М. Васілеўскай у складзе міжнароднага экіпажа пад камандаваннем лётчыка-касманаўта, Героя Расіі, ураджэнца Беларусі А. Навіцкага.

**Роўнасць правоў грамадзян Беларусі і Расіі**

У Саюзнай дзяржаве замацаваная роўнасць правоў грамадзян Беларусі і Расіі. Паміж дзвюма краінамі падпісанае пагадненне, якое забяспечвае беларусам даступнасць медыцынскай дапамогі ў Расіі і наадварот.

У Беларусі і Расіі ўзаемна прызнаюцца дакументы аб адукацыі. Грамадзяне дзвюх краін маюць роўныя правы на працаўладкаванне, аплату працы. Яны могуць свабодна выбіраць месца жыхарства на тэрыторыі Саюзнай дзяржавы. Пры перасячэнні беларуска-расійскай мяжы беларусам і расіянам не патрабуецца праходжанне памежнага кантролю, мытнага нагляду.

Супольныя праграмы Саюзнай дзяржавы, якія зацвярджаюцца рашэннем Вышэйшага Дзяржаўнага Савета і фінансуюцца з бюджэту Саюзнай дзяржавы, ахопліваюць розныя сферы, у тым ліку наву-

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ



У лютым 2025 г. выканаўчы дырэктар праграмы Саюзнай дзяржавы «Комплекс — СГ» С. Караняка адзначыў, што запланаванае стварэнне арбітальнай групоўкі спадарожнікаў: «У апошнія гады ў свеце намецілася тэндэнцыя мініяцюрызацыі касмічных апаратаў, каб запускаць у космас не толькі асобныя ўзоры, але і цэлыя арбітальныя групоўкі. Цяпер паводле новай саюзнай праграмы ствараецца арбітальная групоўка касмічных апаратаў».

1. *У чым значнасць супольных праграм Беларусі і Расіі па асваенні касмічнай прасторы?*
2. *Выкарыстоўваючы матэрыялы інфармацыйна-аналітычнага партала Саюзнай дзяржавы, даведайцеся, якія супольныя праграмы і праекты рэалізуюцца зараз, якія іх мэты і значэнне для Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі.*

ковую і навукова-тэхнічную, прамысловасць, будаўніцтва, інавацыі і новыя тэхналогіі, космас, IT-тэхналогіі, авіябудаванне, вытворчасць беспілотных лятальных апаратаў і інш. Яны выступаюць эфектыўным сродкам паглыблення беларуска-расійскай інтэграцыі. Нашы краіны імкнуцца да адзінай прамысловай палітыкі, якая заключаецца ў роўных умовах гаспадарання для беларускіх і расійскіх прадпрыемстваў.

**3. Узаемадзеянне ў сферы знешняй палітыкі і бяспекі.** Дамова аб стварэнні Саюзнай дзяржавы скіроўвае Беларусь і Расію на аб'яднанне намаганняў па забеспячэнні бяспекі і падтрыманні высокай абараназдольнасці. Супрацоўніцтва паміж дзвюма дзяржавамі ў ваеннай сферы прадугледжвае ажыццяўленне супольнай абароннай палітыкі, каардынацыю дзейнасці ў галіне ваеннага будаўніцтва, распрацоўку і размяшчэнне сумеснага абароннага заказу на прадпрыемствах.

Аб'яднанне намаганняў у галіне бяспекі

Важным элементам супрацоўніцтва ў галіне абароны выступае наяўнасць супольнай беларуска-расійскай рэгіянальнай групоўкі войскаў. Яна забяспечвае абарону Саюзнай дзяржавы на заходнім напрамку. Дзве краіны стварылі сумесную сістэму супрацьпаветранай абароны.

Паміж Рэспублікай Беларусь і Расійскай Федэрацыяй заключаныя пагадненні па розных кірунках ваеннага і ваенна-тэхнічнага супрацоўніцтва. У інтарэсах рэгіянальнай групоўкі войскаў сумесна выкарыстоўваюцца аб'екты ваеннай інфраструктуры на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

Супрацоўніцтва паміж ваеннымі ведамствамі ахоплівае практычна ўсе пытанні ваеннай сферы. Яно грунтуецца на прынцыпах роўнасці і ўліку інтарэсаў партнёра. У снежні 2001 г. прынятая Ваенная дактрына Саюзнай дзяржавы, у якой вызначаныя асноўныя палажэнні яе абароннай палітыкі. Ва ўмовах узмацнення канфрантацыі з Захадам пасля 2020 г.

Беларусь і Расія пайшлі на значнае ўзмацненне ваеннага ўзаемадзеяння. У 2021 г. міністэрствы абароны дзвюх краін падпісалі праграму стратэгічнага партнёрства на пяць гадоў. У лістападзе 2021 г. была прынята абноўленая Ваенная дактрына Саюзнай дзяржавы, а ў 2022 г. — разгорнута рэгіянальная групоўка войскаў.

### Узаемная падтрымка на міжнароднай арэне

У рамках Саюзнай дзяржавы Беларусь і Расія каардынуюць свае дзеянні на міжнароднай арэне. Кожныя два гады партнёры падпісваюць праграмы ўзгодненых дзеянняў у галіне знешняй палітыкі. Па асноўных пытаннях міжнароднай палітыкі Беларусь і Расія займаюць аднолькавыя або вельмі блізкія пазіцыі. Наша краіна неаднаразова атрымлівала

## ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ




*Эмблема III Міжнароднага антыфашысцкага кангрэса «За адзінства ўсіх антыфашысцкіх сіл, за поўную перамогу над нацызмам». Расійская Федэрацыя, 2025 г.*




*Урачыстае шэсце «Беларусь памятае». 9 мая 2019 г.*

1. *Прывядзіце прыклады сумеснай барацьбы народаў Беларусі і Расіі супраць варожых захопнікаў.*
2. *Якую ролю адыгрываюць Рэспубліка Беларусь і Расійская Федэрацыя ў справе захавання гістарычнай памяці і барацьбы з пашырэннем нацызму ў сучасным свеце?*

падтрымку з боку Расіі ў рамках міжнародных арганізацый (ААН, АБСЕ, Савет Еўропы).

Беларусь рэгулярна галасуе супраць антырасійскіх рэзалюцый у ААН і іншых міжнародных арганізацыях. Агульныя намаганні дзвюх краін на міжнароднай арэне скіраваныя на пабудову шматпалярнага сусветнага парадку з улікам інтарэсаў усіх дзяржаў.

**4. Рэгіянальнае супрацоўніцтва.** У рамках Саюзнай дзяржавы актыўна развіваюцца беларуска-расійскія сувязі на рэгіянальным узроўні. Наша краіна падтрымлівае ўзаемавыгадныя гандлёва-эканамічныя, навукова-тэхнічныя і культурныя сувязі з расійскімі рэгіёнамі.

На рэгіянальным узроўні заключана больш за 170 дамоў, пагадненняў і пратаколаў аб гандлёва-эканамічным, навукова-тэхнічным і культурным супрацоўніцтве. У Беларусі дзейнічае 8 прадстаўніцтваў адміністрацый расійскіх рэгіёнаў. Рэгулярнымі з'яўляюцца візіты кіраўнікоў расійскіх рэгіёнаў у Беларусь з мэтай наладжвання непасрэднага супрацоўніцтва з беларускімі партнёрамі.

**Форумы рэгіёнаў Беларусі і Расіі**

Важнай формай канструктыўнага ўзаемадзеяння на рэгіянальным узроўні зрабілася правядзенне маштабных *форумаў рэгіёнаў* Беларусі і Расіі, на якіх заключаюцца шматмільённыя бізнес-кантракты, падпісваюцца пагадненні аб супрацоўніцтве ў адукацыйнай, навуковай і іншых сферах. Першы з іх прайшоў у 2014 г. у Мінску. Ад тых часоў форумы праходзяць штогод.

Эфектыўнай формай супрацоўніцтва рэгіёнаў Беларусі і Расіі з'яўляецца наладжванне сумесных вытворчасцей прадпрыемствамі дзвюх краін.

Прывядзіце прыклады сумесных прадпрыемстваў Беларусі і Расіі.

*Саюзная дзяржава Беларусі і Расіі зрабілася заканамерным вынікам супольнага гістарычнага шляху братніх народаў, злучаных агульнасцю культурных традыцый. Высокі ўзровень супрацоўніцтва дазваляе забяспечыць эканамічную і палітычную бяспеку суверэнных дзяржаў. У рамках Саюзнай дзяржавы захоўваюцца дзяржаўны суверэнітэт і незалежнасць яе ўдзельнікаў.*

**калі ў свеце…**

29 сакавіка 1996 г. — прэзідэнты Беларусі, Казахстана, Кыргызстана і Расіі падпісалі ў Маскве пагадненне аб паглыбленні інтэграцыі ў эканамічнай і гуманітарнай галінах

**на тэрыторыі Беларусі…**

2 красавіка 1996 г. — падпісанне Дамовы аб стварэнні Супольнасці Беларусі і Расіі

## ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Назавіце этапы станаўлення міждзяржаўных адносін Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі. У чым заключаецца ўнікальнасць Саюзнай дзяржавы для агульнасусветнай практыкі?
2. Складзіце ментальную карту (або схему) «Фарміраванне адзінай эканамічнай, сацыяльнай і тэхналагічнай прасторы Беларусі і Расіі».
3. Якое значэнне мае ваеннае і ваенна-тэхнічнае супрацоўніцтва Беларусі і Расіі для забеспячэння бяспекі дзяржаў?
4. У чым заключаецца значнасць рэгіянальнага супрацоўніцтва Беларусі і Расіі для развіцця абедзвюх дзяржаў?